КРЫВІЯ

Культурна асьветніцкая газэта

Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі

#7 ліпень - жнівень 2007

Аўтарскія чытаньні

Беларускі месяц у Брно, сустрэча з Андрусём Хадановічам, гутаркі зь Янам Максімюком і Максімам Шчурам...

старонкі 1, 2, 4.

уМоўнае пытаньне

Што сабою ўяўляе беларуская мова? Аўтарскія погляды на моўнае пытаньне. Ўмовы, створаныя ў Беларусі і навучаньне ў школах. Меркаваньне аўтараў газэты...

старонкі 3, 4, 5 .

Басовішча

Гэтым годам з Прагі ў польскі Беласток была накіравана вялікая група чэскага дэсанту беларусаў для задавальненьня сваіх музычных пажаданьняў...

старонка 6 .

Прыгоды Пушкіна

Ізноў сабраўся Пушкін у паход на Вільню. Ізноў з прыгодамі й скандалам. Але гэты паход стаўся ня першы і ня апошні. І верым мы, што мастацтва мастака знойдзе сваіх прыхільнікаў...

старонка 7 .

Курсы чэскай мовы

Арганізацыя дапамогі і парады для мігрантаў праводзе бясплатныя курсы для замежнікаў па чэскай мове, ангельскай мове і кампутарныя курсы. Больш падрабязна пра час і ўзроўні навучаньня чытайце ў артыкуле на апошняй старонцы....

старонка 8 .

Сустрэча з Андрусём Хадановічам

29-га ліпеня ў беларускай клюбоўні ў Празе адбылася цікавая сустрэча з паэтам і бардам Андрусём Хадановічам, удзельнікам літаратурнага фэстывалю Месяц аўтарскага чытаньня ў Брно. Людзей у клюбоўню прыйшло больш чым разлічвалі сабраць і таму некалькі чалавек размесьціліся на дыване на падлозе. Андрэй спачатку прачытаў некалькі правакацыйных вершаў, каб справакаваць слухачоў на дыялёг і на працягу 2 гадзін ён пасьпеў атрымаць некалькі зьедлівых каментароў. Найбольшай папулярнасьцю карысталіся лірычныя вершы. Аўтару гэтых радкоў больш запомніўся верш пра рамонкавую гарбату. Сапраўды, як часта і ў звычайным жыцьці нашыя душы патрабуюць цуда і

каханьня, нават калі ты купляеш, а потым п'еш простую гарбату. Пасьля аўтарскай чытанкі Андрэй Хадановіч прэзэнтаваў сваю новую кнігу і раздаваў подпісы са сваімі пажаданьнямі. Для "фанатаў", якія не сыйшлі і праз 15 хвілін пасьля заканчэньня імпрэзы ён падараваў бонус-гадзіну сьпеваў пад гітару, пачынаючы з вядомага гіту "Гатэль Беларусь".

Васіль Курэц

ЖЖ "Беларуская Прага"

Літаратурны фэстываль

Месяц аўтарскага чытаньня

Měsíc autorského čtení

ročník: VIII

Ад 1 да 31 ліпеня 2007 у горадзе Брно праходзіў чарговы – 8-ы па ліку – фэстываль "Месяц аўтарскага чытаньня", найбуйнейшы літаратурны фэстываль у Чэхіі. Ганаровымі гасьцямі фэстывалю з замежжа сёлета былі беларускія літаратары.

Штодня на працягу ўсяго ліпеня на сцэне славутага тэатру "Husa na provázku" ("Гусь на канаце") адбываліся дзьве літаратурныя сустрэчы – з адным беларускім госьцем і з адным чэскім пісьменьнікам, гэта значыць, што агулам за месяц сваю творчасьць аматарам прыгожага пісьменства былі прадстаўленыя 60 аўтараў, зь іх – 30 беларускіх. Гэта, бадай, першая такая буйная прэзэнтацыя сучаснай беларускай літаратуры ў сьвеце.

Сярод беларускіх удзельнікаў – гранды айчыннай літаратуры (Уладзімір Арлоў, Алесь Разанаў, Уладзімір Някляеў), выбітныя аўтары сярэдняй генэрацыі (Леанід Дранько-Майсюк, Пятро Васючэнка, Ігар Бабкоў, Барыс Пятровіч), зоркі і зорачкі маладзейшага пакаленьня (Андрэй Хадановіч, Альгерд Бахарэвіч, Андрэй Курэйчык, Ільля Сін, Вольга Гапеева, Вера і Віктар Жыбулі...).

А проч літаратараў непасрэдна зь Беларусі, удзел бяруць і беларускія аўтары зь Беласточчыны (Надзея Артымовіч, Міра Лукша, Міхал Андрасюк, польскамоўны Ежы Плютовіч), а таксама "праскія беларусы" (Макс Шчур, Аляксандар Лукашук, Ян Максімюк, Сяргей Абламейка).

Сьпевамі праграму ўразнастаілі Лявон Вольскі ды Віктар Шалкевіч.

Сярод чэскіх удзельнікаў – такія вялічыні, як Яхім Топал, Міхал Вівэг, Віёла Фішарава, Арношт Голдфлам, Павал Когаўт, Марцін Райнэр, Богдан Трояк ды іншыя.

Увага! Ўсе вечарыны перадаваліся ў рэжыме on-line на старонцы www.autorskecteni.cz! Тамсама можна знайсьці і ўсю падрабязную інфармацыю пра фэстываль "Месяц аўтарскага чытаньня"

Ян Максімюк: “Беларускі народ – шматмоўны і шматкультурны”

Гутарка зь Янам Максімюком, удзельнікам “Месяца аўтарскага чытаньня“.

У чэскім Брне скончыўся літаратурны фэстываль “Месяц аўтарскага чытаньня”. Штодня ганаровыя госьці – беларускія літаратары. У суботу 21 ліпеня сваё эсэ “З бліжэйшых пластоў забыцьця” чытаў перакладчык Ян Максімюк.

Знаткевіч: “Ян, якія ў вас самыя яркія ўражаньні ад чытаньня ў Брне?”

Максімюк: “Самае моцнае ўражаньне – тое, што ў гэтую сьпякоту, вышэй за 30 градусаў, прыйшлі нейкія такія заўзятыя фанаты літаратуры, ды яшчэ ў суботу, калі чалавеку лепш ляжаць у ваньне і папіваць халоднае піва, там чалавек 15 набралося і прыйшло паслухаць нейкае эсэ пра беларускі лёс на Беласточчыне... Гэта было самае яркае ўражаньне”.

Знаткевіч: “Вам задавалі пытаньні паводле вашага эсэ. Як вы лічыце, ці ня ёсьць паваенныя падзеі на Беласточчыне, пра якія вы пісалі, нейкай мадэльлю будучыні для Эўропы?”

Максімюк: “Я пісаў і пра даваенны лёс, і пра лёс маёй сям’і ў часе першай сусьветнай вайны... Я думаю, што ў маім эсэ быў ярка выражаны рэгіянальны пачатак. Я вельмі люблю ўсялякія рэгіянальныя адметнасьці, рэгіянальныя мовы, таму ў Брне мне задавалі пытаньні людзі, якія таксама стараюцца захоўваць сваю рэгіянальную мараўскую адметнасьць.

Думаю, што тыя новыя краіны Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, якія ўвайшлі нядаўна ў Эўразьвяз, якраз крыху заклапочаныя тым, што дзеецца ў гэтай палітычнай сябрыне дзяржаў, таму што яны, толькі што вызваліўшыся ад савецкага таталітарызму, раптам трапілі ў нейкі нібыта дэмакратычны звышдзяржаўны арганізм, які кіруецца з аднаго цэнтру. І таксама людзі баяцца, яны кажуць, што Эўропа павінна быць Эўропай розных айчынаў, а ня нейкай “зраўнялаўкі”. Таму ўсе людзі, якія жывуць у паасобных рэгіёнах Эўропы, баяцца за сваю рэгіянальную ідэнтычнасьць”.

Знаткевіч: “Вы спрабуеце кадыфікаваць падляскую гаворку, выдаць слоўнік. Таксама вы гаварылі на гэтай сустрэчы пра свой плян выдаць пераклад на падляскую мову аднаго нарвэскага раману і надрукаваць яго ў Менску як мастацкую правакацыю. Ці можаце вы сказаць, ці ёсьць нейкія канкрэтныя пляны, даты?”

Максімюк: “Плян ёсьць, а датаў канкрэтных яшчэ няма, бо я ў сваёй правакацыі іду крышку далей – я б хацеў узяць грошы ад нарвэсцаў на выданьне гэтага раману ў Менску на падляскай гаворцы, што гучыць пакуль абсалютна фантастычна і для мяне. Адзін раман гэтага пісьменьніка я апублікаваў па-беларуску ў “Архэ”, былі добрыя водгукі. Цяпер я хачу апублікаваць у Менску пад адной вокладкай два раманы – адзін па-беларуску, другі па-падляску. Абодва пераклады ўжо гатовыя, іх можна выдаваць – патрэбныя толькі грошы.

Ёсьць такі вельмі багаты нарвэскі фонд падтрымкі перакладчыкаў “Нурля”. Я яшчэ фармальных рухаў у гэтым кірунку не зрабіў, але неўзабаве зраблю. Што тычыцца майго падляскага праекту ўвогуле, то ён паволі прасоўваецца: я напісаў ужо тры разьдзелы граматыкі гэтай мовы, пачаў рабіць слоўнічак...”

Знаткевіч: “Як бы вы адказалі на такі закід, які можна будзе пачуць: маўляў, беларуская мова цяпер перажывае не найлепшыя часы ўвогуле, а калі яшчэ тыя людзі, якія маглі б прасоўваць менавіта беларускую літаратурную мову, раптам мачынаюць займацца падляскімі, палескімі гаворкамі, то гэта ня йдзе на ўзмацненьне беларускай літаратурнай мовы... Што б вы на гэта сказалі?”

Максімюк: “Я б сказаў, што нельга так ставіць пытаньне, бо з таго, што я назіраю ў апошнія 10-15 гадоў, я зразумеў, што беларускі народ – гэта народ шматмоўны, я б сказаў, шматкультурны. На гэтай тэрыторыі перасякаюцца розныя культурныя ўплывы, і, відаць, мы ніколі не дасягнем такой сытуацыі, калі беларуская літаратурная мова запануе ва ўсёй Беларусі. Трэба зьмірыцца з тым, што беларуская літаратура, якая будзе разьвівацца ў Менску і іншых гарадох, будзе дзьвюхмоўнай – частка будзе пісаць па-беларуску, частка па-расейску. Да гэтага трэба будзе прызвычаіцца і інтэлектуальна гэта заакцэптаваць.

На Беласточчыне сытуацыя такая, што частка людзей гаворыць дыялектамі, вельмі падобнымі да беларускай літаратурнай мовы, якія бытуюць і на Гарадзеншчыне, але пераважная большасьць людзей, якія запісаліся беларусамі ў Польшчы, гэта каля 70%, гавораць падляскімі дыялектамі, якія належаць да шырэйшай групы палескіх гаворак.

Я лічу, што мая ініцыятыва ўзмоцніць беларускасьць на Беласточчыне, бо зараз у нас трагічна ўпаў тыраж “Нівы” ў параўнаньні з 1960-мі гадамі. Пад канец 1960-х гг. выдавалася 10 тысяч экзэмпляраў газэты, цяпер выдаецца меней за тысячу. Я лічу, што адна з прычынаў – тое, што для бальшыні патэнцыйных і рэальных чытачоў “Нівы” роднай мовай зьяўляецца менавіта падляская, а не гарадзенская гаворка. Таму мая ідэя ўвесьці гэтую мову ў ранг пісьмовай мовы, на якой бы былі публікацыі ў “Ніве”, гаварылі на радыё і на тэлебачаньні – думаю, гэта толькі б узмацніла беларускасьць. Так што тут няма ніякай небясьпекі для беларускай мовы. Пры гэтым хачу выразна зазначыць, што не адракаюся ад беларускай мовы, у сваіх перакладчыцкіх намаганьнях я буду ісьці двума шляхамі: буду перакладаць і на беларускую, і на падляскую.

Чым мяне асабіста кранулі гэтыя чытаньні ў Брне: за маёй памяці гэта першая такая прэзэнтацыя беларускай літаратуры за мяжою, дзе беластоцкае адгалінаваньне беларускага прыгожага пісьменства трактуецца як неад’емная частка беларускай літаратуры. Арганізатар зь беларускага боку Сяргей Сматрычэнка запрасіў вельмі моцную, выразную рэпрэзэнтацыю літаратараў Беласточчыны – гэта Надзея Артымовіч, польскамоўны беларускі пісьменьнік Ежы Плютовіч, будуць выступаць яшчэ Міхась Андрасюк і Міра Лукша... На 30 пісьменьнікаў, якія чытаюць беларускую літаратуру ў ліпені, запрашэньне чатырох важных пісьменьнікаў зь Беласточчыны – гэта мяне кранула”.

Знаткевіч: “Чаму чатырох, а не пяці? Сябе вы пісьменьнікам ня лічыце?”

Максімюк: “Сябе я да пісьменьнікаў не залічваю – калі мяне пытаюць, то я кажу, што я беларускі літаратар, а не пісьменьнік. Я ня ведаю, чаму якраз перакладчыў ня лічаць пісьменьнікамі – я думаю, што гэта памылка, але няхай ужо будзе як ёсьць. Той, хто не пераклаў, а сам напісаў адзін верш, ужо лічыцца пісьменьнікам, а такі чалавек як я, які нічога акрамя эсэ свайго не напісаў – ніякай фікцыі ці фабулы, дык яго ніхто ў Беларусі пісьменьнікам ня лічыць. Калі б я сказаў, што я беларускі пісьменьнік, некаторыя б абурыліся ці пачалі сьмяяцца...”

Ян Максімюк – выбітны дзяяч беларускай культуры, паліглёт, перакладчык, эсэіст, палітычны аглядальнік Радыё Свабода. Нарадзіўся ў 1958 годзе на Беласточчыне, з 1998-га жыве ў Празе. Перакладае зь беларускай мовы на польскую ды з ангельскай, французкай, нарвэскай, чэскай (напр., Эгана Бонды або Багуміла Грабала) і іншых на беларускую. Свае пераклады публікуе ў Польшчы і Беларусі. Найбольш праславіўся перакладам на беларускую “Ўліса” Джэймса Джойса (1993). Таксама яму належыць спроба кадыфікацыі “сваёй мовы”, то бок гаворак Падляскага ваяводзтва. На “МАЧ” чытаў эсэ “З бліжэйшых пластоў забыцьця” – трагічную гісторыю ўласнага роду на тле гістарычных пераўтварэньняў XX стагодзьдзя.

Гутарку вядзе Аляксей Знаткевіч, Прага

Чэмпіянат сьвету па акынскай паэзіі

Гэты сьвет цудоўны,
бо хіба ж ня цуд -
прамовіць такую банальнасьць
і не памерці ад сораму!

А ты яшчэ як жывы,
хоць і крыху прысаромлены,
разгублены ці то загублены? -
у гэтым сьвеце.

Так, быццам ясі пэрсік
у найшыкоўнейшай залі рэнэсансавай вілы,
і загадзя турбуесься, думаючы,
куды выкінуць костку,
бо няможна ж тут хадзіць з косткаю ў руцэ,
а сьметніцы нідзе не відаць,
як раптам выяўляецца,
што косткі няма.

І ты, як стары дасьведчаны акын,
гатовы сьпяваць ад радасьці,
бо ўсе іншыя нечага шукаюць,
а ты ўжо знайшоў.

І ты расчыняеш акно,
як вялізарны ноўтбук,
высоўваесься па пояс —
і крычыш,
а потым захоплена слухаеш рэха,
быццам чакаеш,
покуль нехта чапляе
далучаныя файлы
да твайго пасланьня

Андрэй Хадановіч

Вывучэньне беларускай мовы ў Карлавым Унівэрсытэце

Інстытут славянскіх і ўсходнеэўрапейскіх ведаў філязофскага факультэту Карлавага ўнівэрсытэту (Прага, Чэхія) з новага навучальнага году пачне выкладаць беларускую мову. Такое жаданьне выказалі самі студэнты славістыкі.

У лютым гэтага году студэнты зьвярнуліся да адміністрацыі:

‘’«Беларуская мова без сумневаў зьяўляецца культурнаю спадчынай Эўропы. Гэта скарб дадзены Вялікім Княствам Літоўскім, скарб са сваімі асаблівасьцямі: старажытнасьцю й чысьцінёю, які займае ганаровае месца ў сям’і славянскіх моваў. На сёньняшні момант які, на жаль, знаходзіцца пад вялікаю пагрозаю.

‘’Таму мы, ніжэй падпісаныя студэнты, жадаем каб кіраўніцтва Інстытуту зрабіла ўсё неабходнае да правядзеньня навучаньня беларускае мовы на ФФ УК і каб усе зацікаўленыя людзі дапамаглі ў дасягненьні гэтае мэты.»’’’’

Зараз ад кіраўніцтва праскае славістыкі прыйшла добрая навіна. Беларуская мова ў межах Інстытуту славянскіх і ўсходнеэўрапейскіх ведаў філязофскага факультэту Карлавага ўнівэрсытэту вывучацца будзе.

«Ад акадэмічнага году 2007/2008 будзе рэалізаваны двухсэмэстравы курс беларускае мовы для пачынаючых пад кіраўніцтвам доктара Юрася Бушлякова» - напісана ў афіцыйным дакумэнце, які студэнты атрымалі ад кіраўніка Сэмінарыі ўсходнеэўрапейскіх ведаў доктара філязофіі Марэка Пршыгоды.

«Акадэмічны бок ФФ УК вельмі адчувальна ставіцца да праблемаў з акадэмічнымі свабодамі ў сучаснай Беларусі. Вывучэньне гэтае мовы мажліва і мы наблізім малым крокам працэс паразуменьня й больш цесных стасункаў з усімі дэмакратычна думаючымі людзьмі на Беларусі» - дадаў дэкан ФФ УК доктар філязофіі Міхал Стэглік.

Даведка.

Карлаў унівэрсытэт («Karlova Univerzita») – гэта старэйшы ўнівэрсытэт у Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе. Унівэрсытэт быў заснаваны ў 1348 годзе і меў тады 4 факультэты: мастацкі, мэдыцынскі, юрыдычны і тэалёгіі. Сёньня Карлаў Унівэрсытэт складаецца з 17-ці установаў і факультэтаў, у якіх навучаюцца 42000 студэнтаў.

Томаш Гасюль, ЖЖ «Беларуская Прага»

Мова для трох мільёнаў

Што такое беларуская мова сёньня? На беларускай мове выдаецца вузканішавая газэта “Наша Ніва” і рытуальна беларускамоўныя дзяржаўныя выданьні a la “Звязда”. Вяшчаюць нямасавыя “Радыё Свабода” і “Радыё Рацыя”, а таксама рытуальнае, нуднае і непісьменнае дзяржаўнае радыё. Без асаблівых шкадаваньняў з боку грамадзкасьці скасаваўся праект беларускамоўнага перакладу MS Windows. Беларускі дубляж папулярных фільмаў альбо беларусізаваныя вэрсіі папулярных кампутарных праграмаў успрымаюцца сярэднім беларускім абываталям як дзівосныя цікавінкі - і праз рэдкасьць, і праз камусьці сьмешную “падонкавасьць”, а галоўнае – празь нязвыкласьць як чытача, так і перакладчоў да гэткага беларускамоўнага прадукту. І нават абедзьве беларускамоўныя Вікіпэдыі – самыя маленькія сярод Вікіпэдыяў на славянскіх мовах, ня лічачы паўмёртвых моваў кашубскай і лужыцкай, а таксама мёртвай царкоўнаславянскай. Цікава – калі супастаўляць сумарны памер беларускіх Вікіпэдыяў зь Вікіпэдыямі на іншых мовах, беларуская мова гледзіцца на тым фоне, як быццам мае ня больш як 2-3 мільёны носьбітаў.

Гэтаксама, як прыкладна траціна насельніцтва Беларусі стабільна падтрымлівае дэмакратычную апазыцыю, траціна жадае эўрапейскай інтэграцыі Беларусі і траціна ж хоча, каб прэзыдэнт рабіў свае выступы на беларускай мове.

Што-ж, мабыць і трох мільёнаў чалавек можа хапіць у якасьці суайчыньнікаў? А жыцьцёвыя погляды і лёс астатняга насельніцтва Беларусі – мабыць, гэта можа быць іх уласная справа і ўласная праблема?

Зрэшты, пасьля 150 гадоў барацьбы зарозумы “тутэйшых”, тое, што з астатняга біяматар’ялу ня ўсё ў стане зрабіцца паўнавартаснай беларускай нацыяй у клясычным разуменьні - гэта не страчанае Беларусяй, а ўсяго толькі ненабытае ёю. Хай гэтыя людзі жывуць паралельна сваім расейскамоўным жыцьцём, альбо свабодна зьяжджаюць за мяжу, забываюць і асымілююцца, як тое зрабілі сотні тысячаў перад імі. Можна толькі зь пячальнай самагіроніяй перафразаваць словы, здаецца, Лётара дэ Мэзье, апошняга кіраўніка Ўсходняй Нямеччыны, адрасаваныя патоку уцекачоў на Захад праз абвалены Бэрлінскі мур: “Беларусь ня будзе праліваць па вас сьлёзы”. Каму трэба, той усё роўна аднойчы вернецца – альбо душэўна-інфармацыйна нікуды і ня зьедзе.

За аднаўленьне дэмакратыі ў Беларусі змагаюцца побач большасьць людзей, для каго беларуская мова бясспрэчная каштоўнасьць, і меншасьць з тых, для каго яна такой не зьяўляецца. І дэмакратыя, якая аднойчы будзе здабытая, павінна быць патрэбная нацыянальна сьвядомым не для таго, каб прымусіць тыя дзьве траціны насельніцтва размаўляць па-беларуску іўспрыняць беларускую культуру, а (наадварот?) для таго, каб даць прастору для свабоднага разьвіцьця беларушчыны. Прымушаць кагосьці, упіхваць гвалтам у галаву, што іх родная мова - гэта мова, якой яны не карыстаюцца і якую не заўжды разумеюць, справа марная і няўдзячная. Куды прасьцей прывіць хацяб цярпімасьць да тых, хто хоча карыстацца гэтай таксама дзяржаўнай мовай і прымусіць гарантаваць забесьпячэньне правоў беларускамоўных. І ўсё.

Дыктатарскім рэжымам усталяванае табу на беларушчыну праз тое, што беларушчына асацыюецца з вольнадумствам і апазыцыяй. Зрынаньне дыктатуры нязьменна прывядзе да зрынаньня і гэтага табу ў мэдыях і дзяржаўным жыцьці.

А ці трэба нам, беларускамоўным, большага?

Хай у будучым дэмакратычным парлямэнце траціна месцаў належацьме партыі “лукашыстаў з чалавечым тварам”, траціна - ПКБ і АГП, і толькі траціна - беларускамоўным. Але пры гэтым хай беларускай мове будзе гарантаваны паўнавартасны статус дзяржаўнай мовы, калі назвы вуліцаў, анатацыі на таварах абавязаныя будуць падавацца і па-расейску, і па-беларуску, як гэта робіцца, напрыклад, у Казахстане.

Беларуская мова далёкая ад таго, каб лічыцца “паміраючай”, яна мае сваю важную ролю ў грамадзтве, яна прыцягальная, цалкам жыцьцяздольная і без падтрымкі “зьверху”. Але зважаючы на яе сёньняшні стан і на працэс глябалізацыі, ня бачыцца аб’ектыўных умоваў, пры якіх ёй атрымалася б заняць месца побытавай расейскай і бізнэсовай ангельскай. Таму што рэчы ніколі не вяртаюцца на свае кругі. Беларуская мова ёсьць і будзе:

- па-першае мовай цырыманіяльнай,
- па-другое мовай субкультурнай.

Пытаньні толькі ў тым,

1) наколькі шырокім будзе цырыманіяльны ўжытак беларускай мовы

2) наколькі масавай будзе беларускамоўная субкультура,

3) які характар мецьме гэтая субкультура - элітарны ці маргінальны.

Калі беларуская мова ў вуснах чалавека будзе брэндам, сымбалем адукаванасьці, парадачнасьці, эўрапейскасьці, прагрэсу (якасьці, якія, можна сказаць, сёньня маргінальныя ў такой жа ступені, як элітарныя ў нармалёвых умовах) - людзі міжволі будуць самі цягнуцца да яе.

Калі ж беларуская мова будзе брэндам цемрашала-фундамэнталіста і своечасова памяняўшага культурна-палітычную арыен—тацыю чыноўніка - дык застаецца толькі жадаць, каб паменей такіх людзей ганьбілі гэтую мову. Акрамя таго, дзіўную дылему ствараюць мары некаторых нацыянал-рамантыкаў пра тое, каб па-беларуску заразмаўлялі прастытуткі і бандыты. Як слушна адзначыў у сваім эсэ пра беларускую мову Георгі Плашчынскі, беларуская мова – гэта мова, на якой за апошняе стагодзьдзе не было аддадзена ніводнага злачыннага загаду, а беларускамоўныя - гэта нібы адна вялікая сям’я. Але ж звычайна чалавеку ня ўсіх хацелася б пускаць у сваю сям’ю, ці ня так?

Калі нехта змагаецца за ўсеагульнае шчасьце на ўсёй Зямлі, гэта часьцей за ўсё сканчаецца пабудовай ім канцэнтрацыйнага лягеру. Дастаткова, калі ён будзе змагацца за сваё ўласнае шчасьце - але калі будзе рабіць гэта побач зь іншымі людзьмі. Таму, можа, клапацімося меней пра тых, хто не прымае беларускай мовы, і болей пра сябе саміх і пра тое, як нас успрымаюць яны нас?

Алесь Чайчыц, 2007

Наш позірк на артыкул “Мова трох мільёнаў“

Артыкул цікавы й вельмі актуальны. З канчальнымі высновамі аўтара нам, «беларускамоўным беларусам», усё-ж такі нельга згадзіцца, асабліва з наступным абзацам: ... *зважаючы на яе сёньняшні стан і на працэс глябалізацыі, ня бачыцца аб’ектыўных умоваў, пры якіх ёй атрымалася б заняць месца побытавай расейскай і бізнэсовай ангельскай. Таму што рэчы ніколі не вяртаюцца на свае кругі. Беларуская мова ёсьць і будзе:*

- па-першае мовай цырыманіяльнай;

- па-другое мовай субкультурнай.

Што датычыцца сёньняшняга стану беларускай мовы, дык сп. Чайчыц бязумоўна мае праўду. Але, ці маем права ўважаць гэткае становішча за нязьменнае, й незваротнае?

Як самі добра ведаем, не паўстала яно натуральна (як нам даводзяць розныя прыхільнікі русыфікацыі), але як вынік моўнай асыміляцыі (гвалтоўнай у Беларусі).

Працэс такой паступовай асыміляцыі можам назіраць усюды, дзе сёньня пражывае беларуская дыяспара:

Спачатку сям’я карыстаецца роднай мовай толькі дома (паводле апошняе статыстыкі гэта 1/3 насельніцтва Беларусі). Чаму - бо іншай мовы ніколі ня чулі (як раней бывала ў вясковых рэгіёнах), або - бо як дзеці атрымалі пачатковую адукацыю ў беларускамоўных школах.

Але, пры паступовай ліквідацыі ў Беларусі беларускіх пачатковых школаў, і паступовым выцясьняньні беларушчыны з публічнага жыцьця, тыя ж носьбіты роднай мовы (а пазьней таксама іхныя дзеці) пераходзяць у стан расейскай - або ангельскай, польскай, чэскай граматнасьці - залежна ад краіны пражываньня. Тут трэба падкрэсьліць, што беларускамоўныя грамадзяне Беларусі жывуць у абставінах такой жа дыяспары, як іхныя суродзічы за мяжой, толькі на роднай зямлі.

А ад чужамоўнай граматнасьці да актыўнага карыстаньня чужой мовай - толькі крок. Неўзабаве Беларусам, пісьменным толькі ў чужой мове, становіцца лягчэй гаварыць на ёй, чым на сваёй роднай, якую мала дзе чуюць і сустракаюць.

Канчальны вынік: новыя «расейскамоўныя, або англамоўныя, польскамоўныя Беларусы».

Добра, калі гэтыя людзі яшчэ чуюцца Беларусамі, але, часта страта роднае мовы даводзіць і да поўнае дэнацыяналізацыі.

А іхныя дзеці, чуючы ў сям’і толькі чужую мову, давяршаюць сумны працэс асыміляцыі. Праўда, апошнім часам частка моладзі ў Беларусі, нават узгадаваная ў рускамоўных сем’ях, пачынае карыстацца беларускай мовай. Гэта вельмі суцяшальны факт, але на яго цяжка разьлічваць.

На нашу думку, справа ня ў марнасьці прымушаць прыкл. расейскамоўных Беларусаў карыстацца роднай мовай (гэта нам зразумела), але ў маўклівай згодзе беларускамоўнае публікі з сёньняшнім трагічным станам роднае мовы. Як быццам - тут нічога ня зробіш, або «рэчы ніколі не вяртаюцца на свае кругі», як кажа сп. Чайчыц, ды спакойна называе родную мову «субкультурнай»

Праўда, аўтар артыкулу бачыць выхад у «масавасьці» беларускамоўнае субкультуры.

Як-жа дасягнуць гэтай масавасьці?

Перш, рашуча змагацца з хвальшывай тэорыяй дзьвюхмоўя, якое нахабна й цынічна выкарыстоўваецца русыфікатарскімі сіламі.

Сапраўднае дзьвюхмоўе ў публічным жыцьці настане толькі тады, калі беларускамоўныя й расейскамоўныя грамадзяне будуць гаварыць адзін з адным на сваей мове, не пераходзячы на мову суразмоўніка. Маўляў, інакш мяне не зразумеюць.

Каб дасягнуць гэтага стану, трэба, каб на ўсіх узроўнях дзяржаўнага жыцьця адчувалася пашана да тытульнае мовы дзяржавы, г.зн. беларускай.

А гэта стане магчымым толькі наданьнем беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай, - абавязковай мовай дзяржаўнага школьніцтва (на ўсіх узроўнях) і дзяржаўных установаў.

Гэтакі падыход нельга назваць занадта жорскім - ім карыстаецца шмат дэмакратычных краінаў сьвету. Напрыклад у ЗША дзяржаўнае грамадзянства можна набыць толькі здаўшы экзамін зь гісторыі й канстытуцыі краіны - ведама, на тутульнай мове дзяржавы.

рэдакцыя газэты “Крывія“

Максім Шчур: “Фэстываль у Брне – гэта Вудстак беларускай літаратуры...”

Гутарка з Максімам Шчурам, удзельнікам “Месяца аўтарскага чытаньня“

У чэскім Брне скончыўся літаратурны фэстываль “Месяц аўтарскага чытаньня”. Штодня ганаровыя госьці – беларускія літаратары. Сёньня свае творы чытаў Максім Шчур.

Каліноўскі: Пра што былі Вашыя песьні і вершы?

Шчур: Фактычна ў песьнях, якія я сьпяваў і якія былі напісаныя 6-7 гадоў таму, былі адлюстраваныя перадусім мае пачуцьці новапрыбылага эмігранта, чалавека, які ня так даўно разьвітаўся з Радзімай.

Каліноўскі: Вы ўжо дзевяць гадоў жывяце за межамі Беларусі, у вымушаным выгнаньні. Што для Вас асабіста азначае магчымасьць выступіць на гэтым фэстывалі ў Брне?

Шчур: Асабіста для мяне гэта азначае вельмі шмат. Я ня маю магчымасьці выступаць у Беларусі, данесьці нейкім чынам сваю творчасьць да беларускай публікі, прынамсі, мае магчымасьці не такія вялікія. Таму я вельмі ўдзячны арганізатарам гэтага фэстывалю за тое, што я быў запрошаны і змог тут выступіць. Аб’ектыўна кажучы, гэты фэстываль - гэта нешта абсалютна грандыёзнае, штосьці накшталт Вудстаку беларускай літаратуры - тут прадстаўленыя абсалютна ўсе генэрацыі, усе стылі й напрамкі, усе тыпы творцаў. Гэта вельмі рэпрэзэнтатыўны фэстываль. Тут у Чэхіі гэта трэці па ліку, на які быў запрошаны замежны госьць, і для Беларусі гэта вялікі гонар.

Каліноўскі: Адрозна ад іншых удзельнікаў фэстывалю, якія прыяжджаюць зь Беларусі, Вы тут у Чэхіі жывяце шмат гадоў і можаце адказаць – ці адчуваеце Вы цікаўнасьць да беларускай літаратуры ў Чэхіі?

Шчур: Так, адчуваю і павінен сказаць, што, зноў-такі, гэта цікавасьць да беларускай літаратуры абавязаная некалькім канкрэтным людзям, якія працуюць над папулярызацыяй нашай культуры тут. Гэта Сяргей Сматрычэнка, гэта перакладчыца Францішка Сокалава і гэта выдавецтва Větrné mlýny, якое таксама арганізоўвала гэты фэстываль, і шэраг іншых людзей. У сувязі з падзеямі 2006 году гэтая цікавасьць рэзка ўзрасла, менавіта таму і сталася магчымым запрашэньне Беларусі ў якасьці ганаровага госьця на гэты найбуйнейшы ў Чэхіі літаратурны фэстываль мастацкага чытаньня. І гэта быў вельмі правільны выбар – людзі задаволеныя, яны сыходзяць абсалютна не расчараваныя ў тым, што даведаліся аб гэтай, можа быць, дагэтуль ім не вядомай краіне і аб яе культуры.

Макс Шчур (нар. у 1977) - паэт, празаік і перакладчык. У Менскуўлінгвістычнымунівэрсытэце вывучаў гішпанскую мову, пісаў палітычную сатыру і ў 1998 годзе ўцёк ад перасьледу КДБ у Чэхію, дзе цяпер і жыве. Сёлета ў Швэцыі сваім коштам выдаў выбранае са сваёй паэзіі “Раньні збор”. За непублікаваны раман 600-старонкавага сатырычна-палітычнага раману “Там, дзе нас няма” атрымаў прэмію Янкі Юхнаўца (2004). Заснавальнік інтэрнэт-часопісу www.niamiesta.net, у якім публікуе найперш уласныя тэксты і свае пераклады замежных аўтараў на беларускую мову (сярод іх чэхі Ладзіслаў Кліма, Мілан Кундэра, Віцяслаў Галэк).

гутарку вёў Валер Каліноўскі, Прага

Прэм’ер-міністарЧэхіісустрэўся зь беларускімі стажыстамі

Прэм’ер-міністар Чэхіі Мірэк Тапалянэк сустрэўся зь пяцьцю беларускімі стажыстамі, якія навучаюцца ў Чэхіі ў межах праекту “Стажыроўка Паўла Тыгрыда”, арганізаванага Асацыяцыяй міжнародных пытаньняў. Стажысты, якія паводле палітычных прычынаў ня могуць навучацца ў Беларусі, працуюць у Чэхіі па розных спэцыяльнасьцях. Зараз яны праходзяць трохмесячную адукацыйную практыку.

Пра сёньняшнюю сустрэчу беларусаў з кіраўніком чэскага ўраду мы папрасілі распавесьці Антаніна Бэрдыха, старшыню Асацыяцыі міжнародных пытаньняў:

Бэрдых: “Спадар Тапалянэк доўгі час сочыць за разьвіцьцём сытуацыі ў Беларусі. Ён сустракаўся з прадстаўнікамі беларускай апазыцыі і ў той час, калі яшчэ ня быў прэм’ерам і сам знаходзіўся ў апазыцыі. Сёньняшняя сустрэча, аднак, была своеасаблівая тым, што ягонымі суразмоўцамі былі не прадстаўнікі беларускіх палітычных партый, а шараговыя прадстаўнікі грамадзянскай супольнасьці.

Менавіта пасярэдніцтвам гэтай сустрэчы спадар прэм’ер мог даведацца зь першых рук аб тым, што адбываецца ў Беларусі. Для іх гэта была таксама важная сустрэча, таму што яны атрымалі ўяўленьне аб тым, які падыход мае Чэхія да Беларусі, якія пэрспэктывы бачыць у гэтым кірунку чэская дыпляматыя. Думаю, што гэтая сустрэча была цікавай для абодвух бакоў”.

Бэрдых: “Праект “Стажыроўка Паўла Тыгрыда” наша арганізацыя ладзіць ужо другі год. Сэнсам гэтага праекту ёсьць запрашаць у Чэскую рэспубліку прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў Беларусі, знаёміць іх з установамі Чэскай рэспублікі, мясцовым самакіраваньнем, недзяржаўнымі арганізацыямі, адукоўваць іх у вобласьці трансфармацыйных працэсаў у аўтакратычных рэжымах кірункам да дэмакратыі. Сёлета ў праекце удзельнічаюць 5 чалавек зь Беларусі, летась іх было 6. Звычайна, удзельнікі нашых стажаў – маладыя людзі ад 23 да 30 гадоў”.

Даведка: Павал Тыгрыд (1917 – 2003) – славуты чэскі журналіст, у 1939-45 і 1948-89 гг. палітычны эмігрант, заснавальнік часопісу «Сьведчаньне», супрацоўнік «Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода», міністар культуры Чэхіі ў 1994 – 96 гг.

Пра бацькоў, дзяцей і судзьдзяў

«Усе мы ведаем, што сыстэма дрэнная, — усьміхаецца майстар, — але ж паспрабуй сказаць што-небудзь, калі кантракт на год, у цябе дзіцё, а іншай працы няма». «Мы таксама супраць, але калі начальства прыяжджае — маўчым, — падтаквае жонка чыгуначніка, — а я што, у мяне сын у Менск паступае». «У іх улада, міліцыя, войска, суды», — завяршае сусед-«хімік» — вось і паспрабуй рыпніся».

«Каб хто-небудзь абараніў нас ды нашых дзяцей, — гучыць у падктэсьце, — пайшлі б за вамі».

Днямі мая маці атрымала пастанову аб звальненьні. Настаўніца найвышэйшае катэгорыі з 36-гадовым стажам, працавала і ў вёсках роднага Лунінецкага раёну, і ў Пагосьце ды Барані пад Воршай, і ў Віцебску; два гады да пэнсіі — і вось, загад райана. Зуб на яе тачылі даўно: увесь час прынцыпова выступала на сходах, абараняла маладафронтаўцаў, якіх хацелі выдаліць са школы, займалася стварэньнем Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі ў Віцебску, удзельнічала ў выбарах ды назіраньні (дарэчы, у 2004 г з усёй ініцыятыўнай групы сабрала за мяне найбольш подпісаў — 600)… То бел-чырвона-белы сьцяг, скінуты з асьвятляльнае вежы амфітэатру міліцыянтамі, падбярэ, то нейкія падазроныя беларускія спэктаклі паводле Караткевіча зь дзецьмі ладзіць, то шоў беларушчыны замест кляснае гадзіны. На вясновых школьных вакацыях атрымала пісьмовы (!) дазвол на тыднёвую паездку ў Варшаву, дзе, апроч іншага, пахаваны мой прадзед, праваслаўны сьвятар; падрыхтавала дакумэнты, зрабіла замежны пашпарт… У апошні момант з райана патэлефанавалі і папярэдзілі: на Дзень Волі ніякіх паездак. Маці паехала.

Школьны прафкам, сабраны на тэлефанаваньне «згары», бурчэў: от, кіраўніцтва нашымі рукамі хоча такую настаўніцу выгнаць!.. Пабурчэлі, апусьцілі вочы — і прагаласавалі за звальненьне.

Здавалася б, чарговае пацьверджаньне ўсёмагутнасьці рэжыму.

Але назаўтра пасьля звальненьня з 27 бацькоў школьнікаў, што навучаюцца ў матчыным 5 «А», 24 падпісалі зварот у яе абарону. Самі школьнікі склалі ліст дырэктару. Віцебскія калегі-дэмакраты і праваабаронцы распачалі кампанію салідарнасьці. Дыпляматы даслалі запыт у Міністэрства адукацыі. Даведаўшыся праз інтэрнэт, ліст у падтрымку маці напісаў нават адзін зь яе колішніх вучняў, што зьехаў у Ізраіль. Знаёмыя вернікі пачалі мэтадычна абтэлефаноўваць школьнае начальства. І вось ужо ўся настаўніцкая чытае выразкі зь незалежнае прэсы ды раздрукоўкі зь сеціва й перашэптваецца: ага, найшла каса на камень!

У 16-гадовай школьніцы Насты Палажанкі, абвінавачанай у справе «Маладога фронту», звальняюць з працы бацьку, які адзін гадуе дзьвюх дачок. Крысьціну Шацікаву ды Ўладзімера Шылу пагражаюць пазбавіць бацькоўскіх правоў…

Дзякуй Богу, мы з бацькамі адзін аднаго падтрымліваем. Але ведаю, што многім маладафронтаўцам даводзіцца змагацца і з матчыным адчаем, і з бацькавай злосьцю. І калі на вуліцы Менску выходзяць тысячы юнакоў і дзяўчат, не дае спакою пытаньне: а дзе ж іхнія бацькі? Гэта ж так проста: быць побач са сваімі дзецьмі!



Наймацнейшая салідарнасьць — гэта калі бацькі за дзяцей, а дзеці за бацькоў. У час, калі Лукашэнка рыхтуе дзеля ўмацаваньня ўлады сваіх сыноў, а раённая намэнклятура кварталамі скупае для нашчадкаў нерухомасьць у Менску, супрацьстаяць рэжыму здолеюць толькі дружныя беларускія сем'і. Пазьнякі й Вячоркі, Сіўчыкі й Хадыкі, Мілінкевічы ды Казуліны, Вольскія ды Арловы, Навумчыкі ды Шылы.

Рэжым гэта ведае, таму і б'е: дзяцей па бацьках, бацькоў па дзецях.

Прычым робіцца гэта ў афіцыйна абвешчаны Год Дзіцяці.

А вось судзьдзя Таманаў, якому даручылі весьці працэс «Маладога фронту», адмовіўся судзіць дзяцей за тое, што яны хочуць свабоды, праўды й справядлівасьці: падаў заяву на доўгатэрміновы адпачынак у сувязі са станам здароўя. Не запэцканага ў палітычных рэпрэсіях Таманава хацелі ўключыць у рэжым — але судзьдзя, відаць, чытаў у школе «Маладую гвардыю». Як для судзьдзі ў сёньняшняй сытуацыі — сумленны выбар. Цікава, а што: у нас іншыя судзьдзі абсалютна здаровыя? А чыноўнікі? А генэралы?..

Бацькі віцебскіх школьнікаў і судзьдзя Таманаў — не апазыцыянэры. Яны проста беларусы. І калі супраціўляцца рэжыму пачынае не адно апазыцыя, а паспаліты беларускі люд — рэжым асуджаны на паразу.

Падтрымаць сваё дзіця, бацьку ці маці; падпісаць зварот; не падняць руку, калі галасуюць за «палітычнае» звальненьне; прыйсьці на суд да маладафронтаўцаў або своечасова сысьці ў адпачынак па стане здароўя — гэта супраціў, на які здольны кожны. І паверце: у мільёнаў беларусаў ёсьць усе прычыны да такога супраціву далучыцца. Задача дэмакратаў — арганізаваць. Растлумачыць. Даць прыклад.

Калі за дзецьмі падымаюцца бацькі, калі супраць хлусьні й несправядлівасьці паўстаюць і стары, і малы; калі судзьдзі адмаўляюцца за гэта судзіць — значыць, ужо блізка нацыянальнае абуджэньне.

Павал Севярынец

Беларускамоўныя клясы

У Горадні мы сёньня бачылі ўлётку з запрашэньнем для дзетак навучацца ў беларускамоўных клясах. Насамрэч, у мінулым годзе ў такія клясы запісалася літаральна некалькі вучняў, бо інфармацыі пра гэта амаль не было. А самі клясы яшчэ трэба было арганізаваць — тады гэтым займаліся актывісты з ТБМ, дзякуй ім.

Тады, пачуўшы пра гэта, я толькі паціснуў плячыма, бо ўжо было позна. Сёлета ж прынамсі бачым ўлёткі, дзе нам бадзёра расказваюць пра тое, што беларускай мовай рэклямуюцца самыя дарагія брэнды для пасьпяховых людзей (Samsung, Renault, Hugo Boss, Adidas), адчыняюцца спэцыяльнасьці з навучаньнем па-беларуску ў ВНУ, нават Microsoft, паводле напісанага ўва ўлётцы, абяцаў зрабіць беларускамоўныя вэрсіі сваіх праграм. За беларускай мовай - будучыня! - абвяшчаюць аўтары ўлёткі. «Беларуская мова — гэта мова эліты і багатых людзей! Беларуская мова — гэта мова будучыні! Далучайся! Запішы дзіця ў беларускую клясу!»

Унізе лога За Свабоду! і "Малады фронт - не спыніць". Тэкст увогуле добры, праўда ўвесь не запомніў.

Крута такое бачыць, і хочацца, каб іх было як мага болей. Пару соцень такіх улётак і сам бы расклеіў — у прыдатных месцах, само сабой, каб не замінаць людзям і не раздражняць іх. Калі не знайду ў Інтэрнеце, зраблю сам, толькі трэба сьпіс школ з беларускамоўнымі клясамі недзе адшукаць.

Зьміцер Солтан

Без камэнтараў...

Цікавую ды павучальную гісторыю распавялі мне знаёмыя, дзеткі якіх ходзяць у малодшыя класы простай сярэдняй беларускай школы. Аднойчы дзіцё іх дзесяцігадовае ім і кажа: "Нам у школе казалі вам не расказваць, але я скажу па сакрэце, што мы сёння апытальнік запаўнялі!"

- "Што яшчэ за апытальнік?", - цікавяцца бацькі.

- "Ну гэты, на патрыятызм…".

- "…?!".

- "А што там за пытанні былі, хаця б?", - зрэшты апрытомнелі бацькі. - "Ну дык, ці часта вы глядзіце тэлевізар, ці глядзіце беларускія навіны, як вы ставіцеся да нашай дзяржавы, што бацькі кажуць пра нашага прэзідэнта і г.д.", - адказвае дачка.

Пайшлі разбірацца, а разам з імі яшчэ колькі чалавек бацькоў іншых дзетак, і высвятляецца, што, сапраўды, апытанне гэткае праводзілі і дзеткам раілі не казаць старэйшым, а пасля стала вядома, што не толькі у іхняй школцы такое робіцца.

У суседняй дырэктар адмовіўся, ды і паасобныя настаўнікі адмаўляліся, некаторыя нават працай ахвяраваўшы.

А вы ведаеце, што вучыць сёння ваша дзіцё?

Гэта не 1984 год - гэта 2007!!!

ЖЖ-карыстальнік karyzna

Басовішча - 2007

Існуе шмат месцаў у сьвеце куды вандруюць пілігрымы, гэта ісламская Мекка, індускі Тадж Махал, хрэстыянскі Ватыкан і г.д. Дык вось, у беларусаў таксама ёсьць такое месца, як вы здагадаліся гутарка пра Басовішча. Канешне параўнаньне не зусім раўнальнае, але ж у дадзены момант і час, як я лічу, гэта можна паўжыць.

Ужо на працягу 18 год на польскай-беларускай Беласточчыне праходзіць фэстываль беларускай музыкі і ўжо стала традыцыяй, што кожны сьвядомы беларус езьдзіць туду, як тыяж пілігрымы, што вандруюць у самыя сьвятыя месцы нашай цывілізацыі. Не зьяўляюцца выключэньнем і беларусы, якія жывуць за мяжой у заходняй і сярэдняй Эўропе. Ў апошнія гады Басовішча стала на столькі папулярным, што туды едуць прадстаўнікі беларускай дыяспары і з сем'ямі, размова пра чэскіх беларусаў. У гэтым годзе сем'і Рамашэўскіх і Сідорыкаў наведалі Басовішча ў поўным складзе, што само па сабе гаворыць аб будучыні і традыцыях адзінага свабоднага беларускага фэсту. Акрамя таго шмат студэнтаў і прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў Чэхіі таксама наведалі Басовішча, ў апошнія гады вялікую ўвагу на наш фэст зьвяртаюць і замежнікі з Чэхіі і Эўропы.

У гэтым годзе праграма фэсту зьмянілася і падоўжылася да трох дзён, што дало магчымасьць браць удзел большай колькасьці ўдзельнікаў. Папулярнасьць фэсту таксама можна назіраць па гасьцёх, якія прыяжджаюць на Басы. Напрыклад у гэтым годзе быў спадар Мілінкевіч з жонкай.

Таксама цікавасьць да сябе зьвярнуў знакаміты мастак і пэрфомар Алесь Пушкін, які разпавёў свае ўражаньні аб фэсьце: "Я вельмі ўражаны тэхнічным узроўнем фэстывалю, цудоўны гук, выдатнае сьветаабсталяваньне прафесійная арганізацыя, мне спадабалася месца і атмасфэра навакольля, прыгожая падсьветка на дрэвах. Павінен зазначыць высокі ўзровень беларускіх выканаўцаў, іх стаўленьне да выступу, якія яны былі нэрвовыя і засяроджаныя на свой выступ". Трэба адзначыць, што на працягу фэстывалю Алесь маляваў эскізы новай карціны Басовішча.

Таксама мы запыталіся аб думках іншых гасьцей Басовішча. Вось што аб гэтым кажа палітычны ўцякач Антось: «Па палітычных матывах ужо шмат год вымушаны жыць за мяжой, тут у Гарадку я адчуваю сябе, як на

Радзіме - маляўнічая прырода, беларускамоўнае мясцовае насельніцтва і наша сьвядомая моладзь – эліта».

Праграма Басовішча была разнастайная ад усім вядомай Крамы да меньш знаёмых Rasta, Б.Н., Парасон. З новымі песьнямі выступілі Нэйра Дзюбель. N.R.M. таксама выступіў з новым праектам. Журы вылучыла пераможцаў першае месца занялі «Фляўс і Кляйн», другое месца - Sok, трэцьцяе - Unia.

Цікавым момантам фэстывалю быў выступ дзяцей-музыкаў, якія засьпявалі такія словы:

Мама, тата, гэта я, сонца, неба і зямля.
Мама, тата, я люблю, сонца, неба і зямлю!

Гэта сьведчыць пра тое, што падрастае новае пакаленьне беларусаў і Басовішчу жыць!

Жыве Басовішча, Жыве Беларусь!
Сымон Крывіч, Прага

Малады беларус перамог сусьветных фаварытаў

У турніры дзесяцібор'я, які адбыўся 27 траўня ў аўстрыйскім Гэцісе, 21-гадовы беларускі лёгкі атлет Андрэй Краўчанка неспадзявана перамог ведамых канкурэнтаў: сусьветнага чэмпіёна ды ўладальніка сусьветнага рэкорду, Чэха Романа Шэбрле, Амерыканца Браена Клея ды спартоўцаў з Расеі й Казахстану.

Малады Беларус здабыў 8217 пунктаў, зьляпшаючы свой асабісты рэкорд на неверагодных 603 пункты. Праўда, у сьвеце лёгкай атлетыкі, Андрэй асоба ведамая, як сусьветны чэмпіён і рэкардмэн у дзесяцібор'і моладзі.

Вось ягоныя вынікі ў паасобных дысцыплінах дзесяцібор'я:

Бег на 100м — 10.86 сэкундаў.
Скок у далячыню — 7,90 м.
Скок у вышыню — 2,15 м.
Штуршок кулі (ядра) — 13,89 м.
Бег на 400 м. — 47,46 сэк.
Бег на 110 м. зь перашкодамі (бар'ерамі) — 14,05 сэк.
Кіданьне дыску — 39,63 м.
Скок з шастом — 5.00 м.
Кіданьне кап'я — 64,35 м.
Бег на 1500 м. — 4:29,10 сэк.

Андрэй быў запрошаны на падобны турнір, які ў чэрвені г.г. першы раз ладзіўся ў Кладне (блізка Прагі). У гэтай імпрэзе ён узяў удзел, але нажаль, дзеля параненай нагі, быў змушаны заўчасна пакінуць спаборніцтва.

Аднак, Андрэю агульная атмасфэра ў Кладне вельмі спадабалася. Таму ён абяцаў тут выступіць у наступным чэрвені — 2008 году.

Алеся Пушкіна прагналі з экспэдыцыі «Шляхамі графа Тышкевіча»

Пасьля прэзэнтацыі Алесем Пушкіным карціны яму не дазволілі працягваць сплыў па Вяльлі ў складзе экспэдыцыі «Шляхамі графа Канстанціна Тышкевіча», якая зь Вялейкі накіроўваецца ў Коўна.

Пасьля прыпынку ў Вільні капітан беларускай каманды загадаў мастаку забраць свае рэчы й сысьці на бераг. Прычынай здарэньня стаў абраз, які Алесь Пушкін запрэзэнтаваў у Віленскай ратушы. Беларускія дыпляматы, якія бралі ўдзел у імпрэзе, былі шакаваныя зьместам мастацкага твору, а іх літоўскія калегі заявілі, што Пушкін пасварыў Беларусь і Летуву.

Алесь Пушкін далучыўся да беларускай каманды ў Вялейскім раёне. Разам з пяцю іншымі ўдзельнікамі экспэдыцыі ён сплываў па рацэ на плыце па маршруце Камена — Міхалішкі — Быстрыца да летувіскага Буйвіджаю, і далей праз Вільню ў Коўна.

Падчас прыпынку ў Вільні ўдзельнікі экспэдыцыі былі запрошаныя на ўрачысты прыём у ратушу, дзе гасьцей асабіста прыняў мэр Вільні Ёзас Імбрасас. У мерапрыемстве бралі ўдзел прадстаўнікі беларускага пасольства ў Вільні й дэпутаты палаты прадстаўнікоў.

У Вільню Алесь Пушкін прывёз адну са сваіх апошніх працаў, якая яшчэ нідзе не выстаўлялася. Мастак меў намер падараваць яе Віленскаму музэю Івана Луцкевіча. Падчас прамовы ў ратушы Алесь Пушкін запрэзэнтаваў сваю карціну перад публікай, што выклікала скандал.

А. Пушкін: Яшчэ ў Беларусі я запакаваў абраз, баючыся, што вада можа яго зьнішчыць, таму яго ніхто ня бачыў. Падчас прыёму ў ратушы я яго адкрыў і падараваў Музэю Луцкевіча. Там была намалявана праўда. Узьняўшы абраз угару, я сказаў: «Вось Беларусь, яна цяпер у чаканьні. Яна несвабодная. У гэтай краіне шануюцца помнікі Леніна й Суворава, там нельга размаўляць па-беларуску, там судзяць маладафронтаўцаў». Пасьля гэтых словаў я ўручыў абраз мясцовым беларусам, і тады ўсе разьбегліся. Пазьней мяне не пусьцілі на плот. Старшыня нашай каманды Міхаіл Пётух загадаў капітану плыта, на якім я плыў, выгнаць мяне. Усе паплылі далей, а я застаўся адзін на беразе.

На абразе былі намаляваныя чырвона-зялёныя рукі аголенай цяжарнай жанчыны, заплеценыя калючым дротам — гавораць сьведкі здарэньня.

А. Пушкін: Гэта выява несвабоднай Беларусі, якая некага нам хоча нарадзіць.



Каго? Гэта залежыць ад нас. Можа нарадзіць злога й заздроснага чалавека, які на танку пойдзе на суседа, альбо новага графа Канстанціна Тышкевіча, які будзе нас аб'ядноўваць, закладаць музэі, апісваць берагі нашых культур.

Пасьля сустрэчы ў ратушы карціна Пушкіна зьнікла, так і не патрапіўшы ў Беларускі музэй.

Супрацоўніца Музэю Івана Луцкевіча ў Вільні Людвіка Вітушка пяць дзён намагалася знайсьці карціну. Сёньня абраз знайшоўся ў тым самым месцы, дзе яго й пакінуў мастак — у ратушы. Карціна аднак аказалася пашкоджанай, і яе мусяць перадаць на рэстаўрацыю.

Л. Вітушка: У той вечар было шмат жадаючых сфатаграфаваць карціну, а я вымушаная была тэрмінова зьбегчы на працу, таму карціна там і засталася. Цяпер абраз будзе захоўвацца ў беларусаў Вільні, так як і хацеў спадар Пушкін.

Выпадак з карцінай Пушкіна — гэта не адзінае непрыемнае здарэньне, якое здарылася падчас экспэдыцыі. Яшчэ адзін інцыдэнт адбыўся праз тое, што віленскія беларусы прывіталі экспэдыцыю бел-чырвона-белымі сьцягамі. Мясцовая паліцыя нават перапісала пашпартныя дадзеныя асобаў, якія трымалі беларускую нацыянальную сымболіку.

Л. Вітушка: У першы дзень нейкі летувіс вырваў сьцяг, камэнтуючы гэта тым, што сярод сустракаючых знаходзяцца два чыноўнікі. Як пазьней высьветлілася, ён сам аказаўся летувіскім чыноўнікам. Пазьней хтосьці нават выклікаў паліцыю, якая сьпісала дадзеныя асобаў са сьцягамі. Паліцыя патлумачыла гэта тым, што нельга доўга стаяць са сьцягамі.

У 90-ыя гады, калі Літва змагалася за незалежнасьць, менавіта зь бел-чырвона-белымі сьцягамі мы былі ў самых гарачых месцах. Мы стаялі са сьцягамі на ўсіх мітынгах, нават 13 студзеня. На вышэйшым узроўні прымаюцца дэклярацыі, Лукашэнку не дазваляюць уехаць у Літву, а на такім ніжэйшым узроўні ўсё інакш. Дык пра якое паразуменьне можна гаварыць?

Дарэчы, згаданая сытуацыя ўзьнікла ўжо не ўпершыню — нездарма афіцыйнай сымболікай экспэдыцыі зьяўляюцца не нацыянальныя сьцягі абедзьвух краінаў, а сіняе палотнішча з напісам «Вілія-Нярыс».

Міжнародная экспэдыцыя «Шляхамі графа Канстанціна Тышкевіча» распачалася на пачатку чэрвеня ад вёскі Камена Вялейскага раёну. Маршрут сплыву па Вяльлі цалкам адпавядае экспэдыцыі, якую 150 гадоў таму ажыцьцявіў гісторык, этнограф і археоляг Канстанцін Тышкевіч. 3 ліпеня яна мае завершыцца ў Коўне.

Зьміцер Гурневіч

Як зарабляюць грошы з БРСМ

Хлопцы і дзяўчаты, якія едуць улетку ў будаўнічыя студэнцкія атрады, арганізаваныя БРСМ, ня ведаюць чым рызыкуюць. Гісторыя менскага студэнта Мікалая скончылася ў рэанімацыі, і добра яшчэ, што гэта не зайшло крыху далей…

Напэўна кожны студэнт бачыў у сваім універсітэце плякаты з лягатыпам БРСМ і рэклямай студэнцкіх атрадаў, дзе можна "зарабіць грошы, адпачнуць, знайсці сяброў". Студэнт аднаго з Менскіх універсітэтаў, Мікалай, вырашыў паспрабаваць і запісаўся ў такі атрад. Пасля паспяховай сессіі, у пачатку ліпеня, іх накіравалі ў горад Паставы, а адтуль - у нейкую вёску ў пастаўскім раёне.

Першае, што здзівіла бацькоў Мікалая, які паехаў зарабляць грошы - тэлефанаванне з просьбай выслаць грошай. Цікава, навошта? Як высветлілася пазьней, арганізатары іх не кармілі. Увогуле. Студэнтам паказалі, дзе знаходзіцца сталовая, і на гэтым харчаванне ад БРСМ скончылася. Грошы на харчаванне, зразумела, ніхто не вылучаў. Таму першыя дні студэнты харчаваліся тым, што прывезлі з сабой. Ежа хутка скончылася, што і вымусіла патэлефанаваць бацькам. На гэтым праблемы з харчаваннем не скончыліся! Хіба можа быць яшчэ горш? Можа… Сюрпрыз чакаў Мікалая ў суботу зранку. І працягваўся да самага панядзелка. У суботу і нядзелю не працавала сталовая. І крама таксама. Таму, хто не паспеў купіць ежы ў пятніцу, два дні заставаўся галодным. Пра гэтую мясцовую асаблівасць, зразумела, ніхто не ведаў, таму выходныя прайшлі з пустым страўнікам. Калі праблемы з харчаваннем былі вырашаны, узніклі новыя праблемы…

Вялікім пытальнікам устала праблема санітарыі. А дакладней, яе адсутнасці. Бялізну выдалі адразу ж, але адзін "камплект" на ўвесь час. Мікалай ніяк не можа забыць колер бялізны. Па яго словах, не кожная прыбіральшчыца такой бруднай анучай будзе мыць падлогу. А назваць інакш гэтую бялізну немагчыма, бо яна яшчэ і з дзіркамі была. Прыбіральня была на вуліцы і адна на ўсіх. Канешне, ня вельмі зручна, але жыць можна - не зіма ўсё ж такі. А вось душа не было ўвогуле. Як альтэрнатыва побач з мыйнікам стаяла ацынкавае вядро. Таксама бруднае, як і ўсё навокал.

Калі захварэў першы чалавек (цікава, у такіх умовах можна не захварэць?), высветлілася, што ў атрадзе няма нават звычайнай медсястры. І лекаў таксама няма. І ўвогуле, "вы прыехалі сюды працаваць, а не хварэць" - заявіў куратар з БРСМ, калі з пытаннем наконт лекаў звярнуліся да яго. Працавалі шмат, адпачываць амаль не дазвалялі. Будавалі студэнты кароўнік для мясцовага калгасу. Зразумела, што каровам патрэбны дах над галавой, але чаму б не наняць сапраўдных будаўнікоў і пабудаваць кароўнік у два разы хутчэй? Таму, што студэнт - гэта танная працоўная сіла, ня ведаючая сваіх правоў (і абавязкаў, часьцей за ўсё, таксама), якая будзе працаваць столькі, сколькі скажа куратар, бо "хто не будзе працаваць грошай не атрымае ўвогуле". Скончылася праца для Мікалая вельмі хутка. Праз 2 тыдні яго ўвезлі на хуткай ў Паставы, у лякарню. Дыягназ - мененгіт (запаленне мозга). Як ён яго атрымаў, невядома, але ж зразумела, не ад "курортных" умоў працы. Дарэчы, атрад гэты вырашылі зачыніць. Пасля шматлікіх скаргаў. Пасля таго, як захварэлі 22 чалавекі. Пасля таго, як нехта з бацькоў наведаўся да свайго сына… Мікалая сення выпісалі з лякарні, а мінулай ноччу на яго месца прывезлі сябра… Таксама з мененгітам…

У верасні мы адчынім старонкі дзяржаўных газет і пабачым фотаздымкі шчаслівых маладых людзей, прачытаем шматлікія пазітыўныя ураджанні ад студэнтаў, якія ў атрад не ездзілі, але ім "там вельмі спадабалася". А па тэлебачанню выступіць важны дзядзька, які назаве нерэальныя лічбы заробкаў у гэтых атрадах, пералічыць лепшых БРСМ-будаўнікоў, мабыць нават выдасць узнагароды куратарам, якія прымушаюць студэнтаў працаваць без перапынкаў. І зноў пачнецца піяр-кампанія, толькі адна лічба зменіцца, з 2007 на 2008. І зноў паедуць студэнты, і зноў яны будуць жыць у невыносных умовах, зноў яны будуць хварэць, а дзяржаўныя СМІ будуць зноў пісаць пра найлепшы адпачынак для беларускага студэнта - Студэнцкі Будаўнічы Атрад БРСМ.

ЖЖ-карыстальнік ant1killer

Poradna pro integraci

v Praze za podpory Ministerstva práce a sociálních věcí pořádá v rozmezí od 2. října do 6. prosince 2007 pro cizince s dlouhodobým nebo trvalým pobytem a azylem v České republice

KURZ ČESKÉHO JAZYKA PRO CIZINCE

Úroveň začátečníci: každé úterý od 17:30 do 19:00 od 2. října do 4. prosince 2007

Úroveň pokročilí: každý čtvrtek od 17:30 do 19:00 od 4. října do 6. prosince 2007

POČÍTAČOVÝ KURZ PRO CIZINCE

Úroveň začátečníci: 1x za 14 dní ve středu od 16:30 do 18:00 od 3. října. do 28. listopadu 2007

Úroveň pokročilí: 1x za 14 dní ve středu od 16:30 do 18:00 od 10. října do 5. prosince 2007

KURZ ANGLICKÉHO JAZYKA PRO CIZINCE

Úroveň začátečníci: každé úterý od 19:15 – 20:45 hodin od 2. října do 4. prosince 2007

Úroveň pokročilí: každý čtvrtek od 19:15 – 20:45 hodin od 4. října do 6. prosince 2007

*Všechny uvedené **kurzy jsou zdarma**. Pokud bude mít někdo zájem o uvedené kurzy, prosím, kontaktujte nás buď telefonicky (tel. 224 216 758, 603 281 269 Iva Špátová, Libor Kovařík - sociální pracovníci PPI) nebo přímo na adrese Poradny pro integraci:*

Senovážná 2, 110 00 Praha 1

e-mail: ppi@iol.cz

web: www.p-p-i.cz

Показкі

Няшмат хто ведае, што ў Беларусі ў 50-тыя гады былі забароненыя аборты - баяліся прапусьціць Лукашэнку.

Не ў вязніцу, а ў псіхіатрычную лекарню даставілі чалавека, які падрабляў 100-рублёвыя беларускія купюры.

- Набыла сабе даляраў.
- А што ня эўра?
- Даляры таней.

Два сябрукі:
- А ты чуў: рыхтуюць забойства Лукашэнкі!
- А не, ня чуў. Увесь тыдзень да паляваньня гатуюся - стрэльбу прыстрэльваў. Некалі мне навіны глядзець.

Хлопец падыходзіць да дзяўчыны і кажа:
- Ты б не пераспала са мною за 100 даляраў?
- Не!
- Ну зразумей, калі ласка, мне вельмі патрэбны гэтыя грошы...

Сцюардэсса кампаніі "Белавіа":
- Леді і джэнтмены, прыбіральні знаходзяцца ў двух канцах нашага авіярэйсу - ў Менску і ў Маскве!

Згодна дадзенымі соцыялягічных апытаньняў у Беларусі 100% цьвярозых людзей не падтрымліваюць Лукашэнку. А астатнія 83% насельніцтва "ЗА". Пры чым беларусы на гарэлку губляюць больш грошай, чым краіна на войска. Таму і перамог у гарэлкі значна больш.

- Таварыш палкоўнік, за час вашай адсутнасьці ў роце ніякіх здарэньняў ня было!
- Ў роце – зразумела. А што вы, лейценант, робіце ў ложку маёй жонцы?

У двары свайго дому ў Менску забіты незалежны журналіст Н., вядомы сваімі артыкуламі пра махінацыі адміністрацыі прэзідэнта і КДБ Беларусі. Ў Міністэрстве Ўнутраных Справаў пакуль адзіная вэрсія забойства : "Нязвыклая сьпёка, якая зараз стаіць на Мадагаскары і землятрусы ў паўднёвай Азіі …"

Пасьля таго, як у 1999 годзе ў Беларусі не адбыліся прэзідэнцкія выбары пачаўся вялікі міжнародны скандал. Але праз месяц пачалася бамбадыроўка Югаславіі і на Беларусь усе забыліся. Пасьля таго, як у 2001 гаду ў Беларусі былі сфальсіфіцыраваны вынікі прэзідэнскіх выбараў пачаўся вялікі міжнародны скандал. Але праз дзень тэрарысты ўзарвалі Сусьветны Гандлёвы Цэнтар у Нью-Ёрку і пра Беларусь усе забыліся. Пасьля таго, як у 2002 годзе з Беларусі былі дэпартаваны вядомыя палітыкі расейскай Думы, пачаўся вялікі міжнародны скандал. Але ў той жа дзень, тэрарысты захапілі тэатр у Маскве і пра Беларусь усе забыліся.

... Вайна ў Югаславіі, выбухі ў Нью-Ёрку, захоп "Норд-Оста"... На першы погляд, ну якое дачыненьне да гэтага мае Лукашэнка?



Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі

Культурна-асьветніцкая газэта

крывія

РЭДАКЦЫЯ

Сяржук Шпакоўскі

Юрка Станкевіч

Адрас рэдакцыі

11000, Praha-1,

ul. Soukenická, 8

Падпіска/рэкляма:

+420 / 776873747

+420 / 774613356

MK ČR E 16919

e-mail: kryvija@atlas.cz